З А Ц В Я Р Д Ж А Ю
Начальнік Галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай, выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Рэспубліка Беларусь
В. П. Доўнар
« » г.

ПАЛАЖЭННЕ
аб правядзенні Рэспубліканскай культурна-асветніцкай акцыі
"ГРАНІ ТВОРЧАСЦІ"

РАЗДЗЕЛ 1
АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Рэспубліканская культурна-асветніцкая акцыя "ГРАНІ ТВОРЧАСЦІ" (далей – Рэспубліканская акцыя) праводзіцца ў адпаведнасці з Планам мерапрыемстваў па рэалізацыі задачы 4 "Забеспячэнне сацыялізацыі моладзі ва ўмовах сучасных выклікаў" падпраграмы 2 "Дзеці і моладзь – будучыня Беларусі» на 2026 год Дзяржаўнай праграмы «Беларусь інтэлектуальная» на 2026 – 2030 гг.

1.2. Рэспубліканская акцыя праводзіцца з мэтай актуалізацыі і ўдасканалення сістэмы мастацка-эстэтычнага выхавання студэнцкай моладзі на аснове фарміравання каштоўнасных адносін да гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.

1.3. Задачы Рэспубліканскай акцыі:

– далейшае развіццё відава-жанравага дыяпазону аматарскай творчасці, прапаганда сучасных напрамкаў і лепшых узораў мастацкай творчасці;

– стварэнне аптымальных умоў для развіцця і рэалізацыі творчага патэнцыялу студэнцкай моладзі;

– укараненне ў практыку інавацыйных і эфектыўных формаў сацыякультурных камунікацый моладзі.

1.4. Аснова Рэспубліканскай акцыі – тэматычная інтэрактыўная экспазіцыя, прысвечаная Году беларускай жанчыны.

Тэма-дэвіз – МЫ ЎБАЧЫМ ЖАНЧЫН У НЯЗЕМНАЙ КРАСЕ ІХ, ЯНЫ — НАША ШЧАСЦЕ... (*П.Панчанка*).

## РАЗДЗЕЛ 2
## АРГАНІЗАТАРЫ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АКЦЫІ

2.1. Арганізатарамі Рэспубліканскай акцыі з’яўляюцца Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і ўстанова адукацыі “Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі” Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

2.2. Інфармацыйную і іншую падтрымку арганізатарам Рэспубліканскай акцыі могуць аказваць іншыя рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, ведамствы, грамадскія аб’яднанні, фонды і ўстановы (па ўзгадненні).

## РАЗДЗЕЛ 3
## УДЗЕЛЬНІКІ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АКЦЫІ

3.1. У Рэспубліканскай акцыі прымаюць удзел студэнты дзённай формы атрымання адукацыі ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь – асобныя аўтары, творчыя аб’яднанні.

## РАЗДЗЕЛ 4
## ЗМЕСТ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АКЦЫІ

4.1. Рэспубліканская акцыя ўключае: рэспубліканскую выставу-конкурс сучаснай візуальнай творчасці студэнтаў, экспанаванне творчых работ у выставачных галерэях г. Мінска, комплекс культурна-асветніцкіх мерапрыемстваў ва ўстановах вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь.

4.2. Аснова рэспубліканскай выставы-конкурсу сучаснай візуальнай творчасці студэнтаў у рамках Рэспубліканскай акцыі – тэматычная экспазіцыя, якую складаюць творчыя работы ў адпаведнасці з намінацыямі:

**“Летэрынг. Жанчына-Маці”**
**“Графіка. “Нязломная”**
**“Візуальны сэт.“Жанчына-Муза”**
**“Фотаканцэпт. “Моц жаночага натхнення”.**

Аснову творчай работы ў намінацыі **“Летэрынг**. **Жанчына-Маці”** складае выкананае ў тэхніцы “Летэрынг” (літаральна – “маляванне літарамі альбо словамі”, тэхніка выканання, у якой тэкст, графічныя формы і рашэнні з’яўляюцца мастацкімі аб’ектамі) творчае асэнсаванне верша ці цытаты верша Максіма Танка “Рукі маці”, Пятруся Броўкі “Голас

сэрца” і інш. Для ўдзелу прымаюцца творчыя работы (адпаведныя памеру лістоў А2 (420 х 594 мм), А3 (297 х 420 мм), аформленыя ў рамкі або паспарту.

У намінацыі **“Графіка. Нязломная”,** у тэхніцы манахромнай графікі прадстаўляюцца творчыя работы, якія з’яўляюцца візуалізацыямі метафарычных увасабленняў твора Івана Шамякіна “Зеніт”, “Гандлярка і паэт”, Пятруся Броўкі “Надзя-Надзейка” і інш.

Для ўдзелу прымаецца адна ці серыі графічных работ (адпаведныя памеру лістоў А3 (297 х 420 мм), А4 (210 х 297 мм), аформленыя ў рамкі або паспарту.

У намінацыі **“Візуальны сэт. Жанчына-Муза”,** прадстаўляюцца творчыя работы ў розных напрамках і тэхніках выяўленчага мастацтва, якія з’яўляюцца ілюстрацыяй вершаў М. Багдановіча “Вераніка”, “Зорка Венера”, Пятруся Броўкі “Александрына”.

Для ўдзелу прымаюцца работы, аформленыя ў рамкі або паспарту

Намінацыя **“Фотаканцэпт. Моц жаночага натхнення”.**

Гэтая намінацыя прысвечана сучаснай беларускай жанчыне – моцнай, незалежнай і творчай асобе, якая не толькі здольная да поўнай самарэалізацыі, але і актыўна ўплывае на свет вакол сябе. Неабходна паказаць у творчых фокусах шматграннасць і неўтаймаваную сілу жаночага натхнення, якое праяўляецца ва ўсіх сферах жыцця: ад выдатных асабістых дасягненняў і прафесійных поспехаў да глыбокага духоўнага росту і стварэння сапраўднай прыгажосці, якая акружае нас.

Прымаюцца фотаработы (адзінкавыя фатаграфіі або фотасерыі). Фотасерыі павінны складацца з 3-5 звязаных паміж сабой фотаздымкаў, якія разам складаюць адзіную гісторыю ці канцэпцыю.

Да ўдзелу ў намінацыі не дапускаюцца работы, скапіраваныя з інтэрнэту.

Творчыя работы раздрукоўваюцца ў тэхніках фотадруку: друк на палатне, друк на фотапаперы з дазволам не менш 3508 х 4961 пікселяў пры DPI = 300.

Творчыя работы (адпаведныя памеру лістоў А3 (297 х420 мм) афармляюцца ў рамкі або паспарту.

# РАЗДЗЕЛ 5
# ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АКЦЫІ

5. Рэспубліканская акцыя праводзіцца ў 2026 годзе ў тры этапы.

5.1. **Першы этап** Рэспубліканскай акцыі праводзіцца ў **сакавіку – верасні 2026 года.** Арганізацыю і правядзенне гэтага этапу забяспечваюць кіраўнікі ўстаноў вышэйшай адукацыі.

У рамках першага этапу ствараюцца творчыя работы ў адпаведнасці з намінацыямі.

5.2. **Другі этап** Рэспубліканскай акцыі ў форме рэспубліканскай выставы-конкурсу праводзіцца ў **верасні – кастрычніку 2026 года.**

Арганізацыю і правядзенне гэтага этапу забяспечвае рэспубліканскі арганізацыйны камітэт.

Рэспубліканскі арганізацыйны камітэт зацвярджае склад рэспубліканскай экспертнай групы.

Творчыя работы для экспанавання і далейшага ўдзелу ў рэспубліканскай акцыі афармляюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі (дадатак) да **30 кастрычніка 2026 года.**

Ад аўтараў ці кіраўнікоў творчых аб’яднанняў творчыя работы прымаюцца па адрасе: 220007, г. Мінск, вул. Фабрыцыуса, 5, установа адукацыі “Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі” Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (з пазнакай “ГРАНІ ТВОРЧАСЦІ”).

Колькасць работ, прадстаўленых ад установы вышэйшай адукацыі ў кожнай намінацыі – не больш за 5.

5.3. **Трэці этап** Рэспубліканскай акцыі праводзіцца **ў лістападзе 2026 года** ў г. Мінску.

У перыяд з 1 па 10 лістапада 2026 года будзе арганізавана работа рэспубліканскай экспертнай групы. Рэспубліканская экспертная група ацэньвае прадстаўленыя творчыя работы і вызначае пераможцаў і прызёраў рэспубліканскай выставы-конкурсу ў адпаведнасці з намінацыямі.

Экспанаванне творчых работ у форме экспазіцыі-інтэрактыву адбудзецца ў г. Мінску ў мастацкай галерыі “Універсітэт культуры”.

У час экспанавання будуць прадстаўлены арт-інтэрактывы, інсталяцыі, перформансы, адбудуцца сустрэчы з аўтарамі і вядомымі мастакамі.

5.4. **Чацвёрты этап** Рэспубліканскай акцыі праводзіцца **з снежня 2026 года па снежань 2027 года** ў вышэйшых навучальных установах.

Каардынатарам правядзення рэспубліканскай акцыі з’яўляецца ўстанова адукацыі “Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі” Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Непасрэднае правядзенне мерапрыемстваў рэспубліканскай акцыі забяспечваюць установы вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Установы вышэйшай адукацыі накіроўваюць у рэспубліканскі аргкамітэт прапановы аб датах правядзення рэспубліканскай акцыі на базах устаноў вышэйшай адукацыі.

У адпаведнасці з графікам, зацверджаным рэспубліканскім аргкамітэтам, установы вышэйшай адукацыі забяспечваюць арганізацыю экспанавання творчых работ і правядзенне комплексу мерапрыемстваў.

У рамках Рэспубліканскай акцыі ў мэтах апрабацыі эфектыўных інтэрактыўных формаў культурна-асветніцкай работы, укаранення новых падыходаў у вывучэнні культурна-гістарычнай спадчыны беларускага народа студэнты ўстаноў вышэйшай адукацыі забяспечваюць правядзенне мерапрыемстваў для студэнцкай і вучнёўскай моладзі, а таксама для навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі горада і рэгіёна.

Ход і вынікі правядзення ва ўстановах вышэйшай адукацыі мерапрыемстваў Рэспубліканскай акцыі асвятляюцца на інтэрнэт-рэсурсах устаноў вышэйшай адукацыі.

Установы вышэйшай адукацыі накіроўваюць спасылкі на размешчаныя матэрыялы ва ўстанову адукацыі “Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі” Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь па e-mail: nchtdm@nchtdm.by (з паметкай “ГРАНІ ТВОРЧАСЦІ”).

## РАЗДЗЕЛ 6
## ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АКЦЫІ

6. Падвядзенне вынікаў Рэспубліканскай акцыі ажыццяўляецца рэспубліканскім арганізацыйным камітэтам, які зацвярджае рашэнне рэспубліканскай экспертнай групы.

Рэспубліканскі арганізацыйны камітэт забяспечвае ўзнагароджванне па выніках Рэспубліканскай акцыі ў рамках мерапрыемстваў Нацыянальнага студэнцкага форуму і “Маладзёжнай сталіцы Беларусі”.

6.1. Дыпломамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь узнагароджваюцца:

– аўтары творчых работ – пераможцы і прызёры ў намінацыях;

– аўтары творчых работ за мастацкае ўвасабленне ідэі Рэспубліканскай акцыі;

– аматарскія аб'яднанні і кіраўнікі творчых калектываў за шматгадовую рэзультатыўную дзейнасць, вялікі ўклад у мастацка-эстэтычнае выхаванне моладзі, прапаганду сучасных напрамкаў і лепшых узораў мастацкай творчасці;

– творчыя аб'яднанні студэнтаў за апрабацыі, укараненне інавацыйных формаў сацыякультурных камунікацый, новых падыходаў у вывучэнні культурна-гістарычнай спадчыны беларускага народа;

– установы вышэйшай адукацыі за ўкараненне інавацыйных формаў культурна-асветніцкай работы па фарміраванні каштоўнасных адносін да гісторыка-культурнай спадчыны, актыўны ўдзел у Рэспубліканскай культурна-асветніцкай акцыі;

– установы вышэйшай адукацыі за шматгадовую эфектыўную дзейнасць па развіцці мастацкай творчасці студэнтаў, стварэнні аптымальных умоў для рэалізацыі творчага патэнцыялу студэнцкай моладзі.

6.2. Удзельнікі Рэспубліканскай акцыі таксама могуць узнагароджвацца дыпломамі і прызамі, падрыхтаванымі зацікаўленымі ўстановамі і арганізацыямі.

6.3. Рэспубліканскі арганізацыйны камітэт мае права выкарыстоўваць выніковую інфармацыю, творчыя інфармацыйныя матэрыялы пры падрыхтоўцы і правядзенні рэспубліканскіх мерапрыемстваў, вырабе друкаваных выданняў і рэкламнай прадукцыі, размяшчаць выніковую інфармацыю, творчыя інфармацыйныя матэрыялы на інтэрнэт-рэсурсах.

6.4. Творчыя работы вяртаюцца ў тэрмін не пазней за адзін месяц пасля заканчэння Рэспубліканскай акцыі.

## РАЗДЗЕЛ 7
## ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АКЦЫІ

7.1. Рэспубліканскі арганізацыйны камітэт забяспечвае інфармацыйнае суправаджэнне Рэспубліканскай акцыі ў сродках масавай інфармацыі, на інтэрнэт-рэсурсах.

7.2. Пры асвятленні ў сродках масавай інфармацыі, выпуску публікацый, інфармацыйных і рэкламных матэрыялаў, іншым распаўсюджванні інфармацыі ў ходзе правядзення мерапрыемстваў, удзельнікам Рэспубліканскай акцыі – установам вышэйшай адукацыі –

неабходна выкарыстоўваць сімволіку і называць заснавальнікаў Рэспубліканскай акцыі.

7.3. Каардынаты рэспубліканскага аргкамітэта: 220030, г. Мінск, вул. Кірава, 16, установа адукацыі "Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі" Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, тэл. (017) 375 53 76; (017) 377 63 21.

ДАДАТАК

**Патрабаванні**
**да ўдзелу ў рэспубліканскай выставе-конкурсе**

1. Заяўка на ўдзел у рэспубліканскай выставе-конкурсе афармляецца на беларускай мове.

2. Заяўка, зацверджаная кіраўніком творчага калектыву, накіроўваецца разам з творчымі работамі.

3. Электронны варыянт заяўкі дасылаецца па e-mail: nchtdm@nchtdm.by

4. Форма заяўкі на ўдзел у рэспубліканскай выставе-конкурсе

| | |
|---|---|
| Назва ўстановы вышэйшай адукацыі | |
| Намінацыя | |
| Тэхніка выканання | |
| Назва творчай работы | |
| Прозвішча, імя аўтара | |
| Назва творчага калектыву, студыі | |
| Прозвішча, імя, імя па бацьку (поўныя) кіраўніка студыі, нумар кантактнага тэлефона, e-mail* | |
| **Назва твора або цытата з твора па якой зроблена творчая работа** | |

**Кіраўнік калектыву дае згоду на апрацоўку асабістых дадзенных*

**Патрабаванні да афармлення работ**

1. Прафесійнае афармленне экспанатаў (падрамнікі, рамы, паспарту).

2. Суправаджэнне экспаната этыкеткай, прыклеенай або прышытай з адваротнага боку работы, памерам 10 х 5 см.

3. Этыкеткі творчых работ на ўдзел у рэспубліканскай выставе-конкурсе афармляюцца на беларускай мове.

4. Этыкетка размяшчаецца на адваротным баку кожнай творчай работы.

**Узор этыкеткі**

| |
|---|
| **“ДАСКАНАЛАСЦЬ”** |
| намінацыя “Візуальны сэт” |
| тэхніка – выцінанка |
| аўтар Лучына Мікалай |
| студыя “АБ’ЕКТЫЎ” |
| кіраўнік Паланевіч Святлана Андрэеўна |
| УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя Максіма Танка”, факультэт педагогікі і методыкі пачатковага навучання |